УДК 378.147:159.9

В. А. Кузьміч, дац. (БДТУ, г. Минск)

# КАМУНІКАТЫЎНАЯ КАМПЕТЭНЦЫЯ ЯК АДНА З УМОЎ ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ

Паняцце камунікатыўнай кампетэнцыі было ўведзена Дэлам Хаймсам у 60-я гады XX ст. і паўстала на глебе лінгвістычнай прагматыкі, псіхалінгвістыкі, сацыялінгвістыкі і сацыяльнай псіхалогіі.

У 80-я гады XX ст. канадскі вучоны Мэрыл Суэйн з аднадумцамі вылучыў у камунікатыўнай кампетэнцыі чатыры галоўныя кампаненты:

- *граматычны*: уменне карыстацца лексічнымі адзінкамі, правіламі граматыкі і сінтаксісу;
- *сацыялінгвістычны*: веданне таго, як пабудаваць правільнае выказванне ў розных сацыяльных кантэкстах;
- *стратэгічны*: адпаведнае выкарыстанне камунікатыўных стратэгій і ўменне вырашаць складаныя камунікатыўныя сітуацыі;
- *дыскурсіўны*: уменне спалучаць сказы ў адпаведнасці з правіламі дыскурсу, г. зн. будаваць тэкст.

Камунікатыўная кампетэнцыя мае неацэннае значэнне ў самых розных прафесійных сферах і часта мае вырашальнае значэнне для прафесійнай кар’еры будучага спецыяліста. Пра вялізны попыт на спецыялістаў з бездакорнымі маўленчымі навыкамі сведчаць прапановы на рынку працы і вынікі даследаванняў. Для ўсё большай колькасці працадаўцаў камунікатыўная кампетэнцыя – гэта не толькі дадатковы плюс пры найме новага супрацоўніка, але і найважнейшая рыса яго профілю. Высокая моўная кампентэнцыя не заўсёды тоесная з камунікатыўнай кампетэнцыяй, у тым ліку з уменнем наладжваць зносіны ў розных спецыяльных галінах і прафесійных сітуацыях, якія цяжка прадугледзець у працэсе адукацыі. Ва ўмовах адкрытасці краіны для шырокіх міжнародных стасункаў, глабалізацыі сусветнай эканамічнай прасторы патрабуюцца спецыялісты, здольныя акумуляваць ва ўласны прафесійны досвед агульначалавечыя каштоўнасці, актыўна ўключацца ў міжнародны дыялог, захоўваючы і прасоўваючы нацыянальныя інтарэсы. Гэта не толькі выканаўца пэўных працэсаў і функцый, а чалавек, які фарміруе рэчаіснасць вакол сябе. Пры тым не актуальна, у якой сферы – гуманітарнай ці тэхнічнай – ён заняты, бо агульнаадукацыйны і прафесійны досвед і камунікатыўная кампетэнцыя спецыяліста непарыўна звязаны ва ўсіх

сферах зносін. Дынамічны, адукаваны прафесіянал гатовы для ўспрыняцця новых ведаў, разумее неабходнасць усебаковага ўласнага развіцця, хутка адаптуецца да розных прафесійных сітуацый, умее ставіць мэты і дасягаць іх, даносіць інфармацыяю да суразмоўцаў і аргументавана пераконваць іх.

Набыццю камунікатыўнай кампетэнцыі будучых спецыялістаў пры вывучэнні моўных дысцыплін спрыяюць адпаведныя методыкі і формы працы са студэнтамі, якія накіраваны на пашырэнне агульнакультурнага і вузкапрафесійнага кругагляду студэнтаў, фарміраванне ў іх адкрытасці на дыялог. Вядучую ролю ў гэтым працэсе адыгрывае выкладчык, які дапамагае выпрацоўваць правільныя маўленча-камунікатыўныя навыкі.

У межах навучання мове на тэхнічных спецыяльнасцях БДТУ развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі студэнтаў адбываецца ў вучэбным працэсе і праз разнастайныя формы іх творчай дзейнасці, такія, як вуснае маўленне па зададзенай тэме, напісанне тэматычных творчых і навуковых прац, правядзенне тэматычных алімпіяд, гуртковай працы, выкананне сацыяльна значных праектаў заданняў праблемнага характару, якія стымулююць крытычнае мысленне і актыўнае развіццё моўных навыкаў. Пры гэтым надзвычай важна ахопліваць працай па вырашэнні камунікатыўных задач як мага большую колькасць чалавек, таму што менавіта праз калектыўную дзейнасць адбываецца прафесійная сацыялізацыя і найбольш яскрава выяўляецца індывідуальная камунікатыўная кампетэнцыя кожнай асобы, вызначаюцца шляхі яе ўдасканалення.

Праца ў гэтым напрамку праводзіцца не толькі ў межах навучальнай праграмы, але і знаходзіць свой лагічны працяг у асабістых ініцыятывах студэнтаў. Іх удзел і перамогі у разнастайных конкурсах і мерапрыемствах у межах БДТУ, на рэспубліканскім і міжнародным узроўнях сведчаць пра запатрабаванасць камунікатыўна кампетэнтных спецыялістаў незалежна ад напрамку іх прафесійнай дзейнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. Степанов С.С. Способности и карьера – М.: ОЛМА-ПРЕСС, 2001. –124с.

2. Иванов Д.А., Митрофанов К.Г., Соколова О.В. Компетентностный подход в образовании. Проблемы, понятия, инструментарий: учеб.-метод. пособие. – М.: АПКиППРО, 2008. – 101 с.